**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

**На правах рукапісу**

**УДК 94 (476) ”14” (043.3)**

**Любы**
**Андрэй Уладзіміравіч**

# УНУТРЫПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У 30-40-ЫЯ ГГ. XV СТ.

**Спецыяльнасць 07.00.02 – айчынная гісторыя**

**Дысертацыя на суісканне вучонай ступені**
**кандыдата гістарычных навук**

**Навуковы кіраўнік**
**кандыдат гістарычных навук,**
**дацэнт Казакоў Юрый Леанідавіч**

**Мінск – 2006**

ПЛАН


Уводзіны 3

Агульная характарыстыка працы 5

1. Крыніцы і гістарыяграфія 9

*1.1. Крыніцы* 9

*1.2. Гістарыяграфія* 13

2. Барацьба палітычных груповак за кантроль над вышэйшай уладай у Вялікім княстве Літоўскім 28

*2.1. Прычыны, умовы і характар унутрыпалітычнай барацьбы ў 30-ыя гг. XV ст.* 28

*2.2. Мэты і сродкі палітычнай барацьбы* 42

*2.3. Вырашэнне супярэчнасцяў палітычнага жыцця ВКЛ у 40-ыя гг. XV ст.* 53

3. Царква і гарады "зямель прыслухаючых" у барацьбе 30-40-х гг. XV ст. 64

*3.1. Канфесійная сітуацыя ў дзяржаве і яе ўплыў на разгортванне ўнутрыпалітычнай барацьбы* 64

*3.2. Роля царкоўных іерархаў ва ўнутрыпалітычнай барацьбе 30-40-х гг. XV ст.* 70

*3.3. Значэнне Царквы ў стабілізацыі грамадства ў 40-ыя гг. XV ст.* 80

*3.4. Гарады "зямель прыслухаючых" у барацьбе 30-40-х гг. XV ст.* 85

Заключэнне 99

Спіс выкарыстаных крыніц 101

# УВОДЗІНЫ

Перыяд 30-40-х гг. XV ст. быў важным пераходным этапам у жыцці грамадства і правячай эліты Вялікага княства Літоўскага (далей – ВКЛ). Назапашаныя за часы вялікіх князёў Ягайлы і Вітаўта палітычныя супярэчнасці павінны былі вырашыцца па ініцыятыве актыўнай часткі грамадства. Ад гэтага залежала, як існаванне самога грамадства і дзяржавы (кансалідацыя станаў, эканамічных і палітычных груп; дэструкцыя ВКЛ), так і рэалізацыі патэнцыяла палітычнага і эканамічнага развіцця, пераразмеркаванне ўлады і маёмасці, канчатковае афармленне прававоў феадалаў.

Міжнароднае становішча ў рэгіёне Цэнтральнай і Усходняй Еўропы адбівалася на ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў ВКЛ. Падзеі непасрэдна ці ўскосна ўплывалі на сітуацыю ў дзяржаве, трансфармацыю вярхоўнай улады, рэлігійную і дыпламатычную палітыку ў новых геапалітычных умовах. Сярод іх былі ідэя царкоўнай уніі і саборны рух; “уніі” як новыя формы дзяржаўнага ўладкавання ў Еўропе (Кальмарская і Ягелонская уніі); унутрыпалітычныя канфлікты, ці т.зв. феадальныя ці грамадзянскія войны (Гусіцкі рух, феадальная вайна ў Вялікім княстве Маскоўскім, “Вайна руж” у Англіі); паслабленне старых дамінантаў сістэмы міжнародных адносін (Тэўтонскі ордэн у Прусіі і Лівоніі, Арда) і прыход новых (Асманская імперыя).

У падмурак унутранай структуры ВКЛ у канцы XIV – пачатку XV ст. было закладзена некалькі разбураючых элементаў: вялікі князь Вітаўт не меў нашчадкаў для перадачы вялікакняжацкай улады ў спадчыну; існавала пагадненне з Польскім каралеўствам, якое давала магчымасць уплываць на працэс абрання вялікага князя; дзяржава мела поліэтнічны і поліканфесійны склад насельніцтва; прававая сістэма не забяспечвала абарону маёмасных і палітычных інтарэсаў феадалаў; сістэма землеўладання вымагала змен. Адсутнасць моцнай княжацкай улады ў 1430-1431 гг. стварыла крызісную сітуацыю. Для стабілізацыі грамадства і захавання дзяржаўнасці патрабавалася вырашыць наспелыя пытанні.

Перыяд ад замаху на вялікага князя Свідрыгайлу ў Ашмянах (1 верасня 1432 г.) да смерці палітычных апанентаў вялікага князя Казіміра (пачатак 50-х гг XV ст.) уваходзіць у праблемнае поле і разглядаецца ў літаратуры пад тэрмінамі “**грамадзянская вайна**” ці “**феадальная вайна**”. Для польскай нацыянальнай гістарыяграфіі канца XIX – пачатку XX ст. характэрнай назвай з’яўляецца “**паўстанне Свідрыгайлы**”. На жаль, такая назва падзей сустракаецца ў айчыннай літаратуры і з’яўляецца калькай, не тоеснай польскаму сэнсу [128, с. 167-168; 129, с. 642; 36, с. 256-257].

Характарыстыку падзей 30-х гг. XV ст. у літаратуры можна падзяліць на дзве групы: "паўстанне" і "войны". Першы тэрмін тлумачыць канфлікт, як выступленне з боку вялікага князя Свідрыгайлы супраць пэўных сацыяльных і палітычных каштоўнасцяў. Супраціўленне такой палітыцы замацоўвае "легальнасць" змагання з вялікім князем, што і робіць Жыгімонт разам са сваімі прыхільнікамі. Але працэс "паўстання" мае не толькі ўнутраны характар, ён закранае пабудову "саюзнай" дзяржавы, разгортваецца ў кірунку кампрамісных змен палітыкі ВКЛ. "Паўстанне" не адлюстроўвае прычыны падзей і не паказвае праблемы, якія ляглі ў аснову канфлікта, толькі засяроджвае ўвагу на моманце выбуху і непасрэдных ваенных дзеяннях. Другі тэрмін – вайна "феадальная" ці "грамадзянская" – канкрэтызуе ўнутрыпалітычны характар падзей: 30-ыя гг. XV ст., як барацьба ўнутры пануючага класа, ці, якая закранае ўсе часткі грамадства, вядзе да змен сацыяльных адносін. Унутраная вайна змяняе палітычнае становішча дзяржавы на знешнепалітычнай арэне.

У беларускай гістарыяграфіі назва "феадальная вайна" была выкарыстана для характарыстыкі падзей 30-х гг. XV ст. на пачатку 90-х гг. XX ст. побач з назвай "грамадзянская вайна".

Тэрміналогія, ужываемая ў літаратуры, відавочна адлюстроўвае ступень асэнсавання падзей 30-х гг. XV ст. у гістарычнай навуцы канца XIX – першай трэці XX ст. і ў 90-ыя гг. XX ст. Але ў крыніцах сустракаецца і аўтэнтычны тэрмін, які характарызуе падзеі 30-40-х гг. XV ст. У судовых актах часоў вялікага князя Казіміра выкарыстоўваецца вызначэнне **"валка"** (барацьба) [19, с. 312].

Аўтар схіляецца да вызначэння "барацьба", якая датычыцца сэнса падзей на працягу ўсяго перыяду 30-х і 40-х гг. XV ст.

Перыяд 30-40-х гг. XV ст. характарызуецца **палітычным крызісам**, які выявіўся ў аслабленні вялікакняжацкай улады, уздыме цэнтрабежных сіл, актыўнасці розных станаў грамадства: арыстакратыі, набілітэта, мяшчан. Станаўленне афіцыйных адносін талерантнасці (цярплівасці) да праваслаўнага веравызнання вызначылася ў прававым ураўнанні вернікаў-хрысціян ВКЛ.

Асноўнымі праблемамі, якія даследуюцца ў працы, з'яўляюцца: прычыны, рухаючыя сілы, мэты і задачы варагуючых лагераў; вынікі унутрыпалітычнай барацьбы 30-40-х гг. XV ст. для дзяржавы, вялікакняжацкай улады, палітычнай эліты грамадства, дэферэнцыяцыі развіцця рэгіёнаў; фарміраванне адзінага прававога поля для феадалаў; ступень уплыву канфесійнай сітуацыі на унутрыпалітычную барацьбу; выкарыстанне ідэй царкоўнай уніі ў палітычнай барацьбе і дэсакралізацыя свецкай улады ў ВКЛ.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**. Унутрыпалітычная барацьба 30-40-х гг. XV ст. у Вялікім княстве Літоўскім – выключная з'ява ў трансфармацыі грамадства і дзяржаўнасці на беларускіх землях у эпоху Сярэднявечча. Назіраем фрагментарнае вывучэнне яе прычын, вынікаў і рухаючых сіл у айчыннай і замежнай гістарычнай літаратуры. Таму паглыбленае вывучэнне сацыяльна-палітычных адносін неабходна для разумення асноў агульнага гістарычнага працэсу. Ва ўмовах узрастання зацікаўленасці вывучэннем сацыяльных катэгорый грамадства на Беларусі на фоне агульнаеўрапейскіх працэсаў у Сярэднія вякі і Новы час, эвалюцыі ўлады набілітэта, пошукаў унутраных прычынаў інтэграцыйных форм ва ўмовах існавання уніі паміж Польскім каралеўствам і ВКЛ ад дысертацыйнага даследвання патрабуецца сістэматызацыя існуючых матэрыялаў і ўвядзення ў навуковае абарачэнне новай інфармацыі па пытанням вырашэння супярэчнасцяў унутрыпалітычнага развіцця дзяржавы. Набывае актуальнасць для айчыннай гістарычнай навукі аналіз стэрыятыпаў успрымання падзей 30-40-х гг. XV ст., узнікшых у гістарычнай літаратуры пад уплывам грамадскай думкі канца XIX – XX ст. Гэта дазволіць актывізаваць вывучэнне разнастайных аспектаў палітычнага развіцця ВКЛ у другой трэці XV ст.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя выканана ў рамках навукова-даследчай працы кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ 952/91 "Стратыфікацыя беларускага грамадства на фоне агульнаеўрапейскіх працэсаў у XVI – пачатку XIX ст." за 2003-2005 гг. і 363/91 "Падрыхтоўка да выдання "Актаў сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Паўночнай Беларусі. Частка 1. Полацкая зямля XIII – 1-я трэць XVI стст." за 2005-2006 гг.

**Мэта і задачы даследвання.** Мэтай дысертацыйнага даследвання з'яўляецца комплексны аналіз унутрыпалітычных працэсаў у ВКЛ у 30-40-ыя гг. XV ст., у сувязі з чым аўтар паставіў перад сабой вырашэнне наступных задач:

- вызначыць прычыны ўдзелу асобных катэгорый насельніцтва і іх дасягненні ў падзеях унутрыпалітычнай барацьбы ў ВКЛ;
- разгледзець уплыў вялікіх князёў Свідрыгайлы і Жыгімонта на ўнутрыпалітычную сітуацыю ў дзяржаве ў 30-ыя гг. XV ст., а таксама праграму вялікакняжацкай адміністрацыі па стабілізацыі ўнутрыпалітычнага жыцця ВКЛ у 40-ыя гг. XV ст.;
- паказаць у дзейнасці варагуючых лагераў агульныя маёмасныя і палітычныя інтарэсы, а таксама супярэчнасці ўнутры палітычнай эліты;

- раскрыць уплывы свецкай і царкоўнай палітыкі на рэалізацыю праектаў дзяржаўнай і царкоўнай уній;
- прааналізаваць ролю “зямель прыслухаючых” і іерархаў Царквы ў стабілізацыі грамадскага жыцця дзяржавы ў 40-ыя гг. XV ст.

**Аб’ект і прадмет даследвання.** Аб’ектам даследвання з’яўляецца палітычная гісторыя ВКЛ у другой трэці XV ст., а прадметам – унутрыпалітычная барацьба 30-40-х гг. XV ст., прычыны, мэты і задачы ўдзелу ў ёй розных катэгорый грамадства і сацыяльных інстытутаў дзяржавы.

**Метадалогія і метады праведзенага даследвання.** Тэарэтыка-метадалагічным падмуркам даследвання з’яўляюцца прынцыпы гістарызму і аб’ектыўнасці. У працы выкарыстоўваюцца дзве групы метадаў – агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя: аналіз і сінтэз, абагульненне, параўнанне, класіфікацыя, дэдукцыя і індукцыя; гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, якія дазволілі даследваць з’яву ад яе ўзнікнення на ўсіх этапах развіцця; параўнаць станаўленне дзвюх вялікакняжацкіх партый і іх трансфармацыю ў адзіную партыю каралевіча Казіміра ў 40-ыя гг. XV ст.; разгледзіць “барацьбу” як складаную сістэму, элементамі якой з’яўляюцца палітычныя лагеры і сувязі паміж імі, а таксама кланавасць палітычнай эліты, гарадскія абшчыны “зямель прыслухаючых” і сувязі іх з іншымі буйнымі сістэмамі.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Работа ўяўляе сабой першае комплекснае даследванне ў айчыннай гістарычнай навуцы, дзе на сучаснай метадалагічнай аснове прааналізаваны і сістэматызаваны дакументальныя матэрыялы і найноўшыя распрацоўкі айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, якія характарызуюць перыяд 30-40-х гг. XV ст. у ВКЛ. У ёй вызначаны мэты ўнутрыпалітычнай барацьбы і сродкі ўсталявання кантроля над вялікакняжацкай уладай у дзяржаве. Адзначана, што ў падмурку крызіснай сітуацыі ў ВКЛ пачатку 30-х гг. XV ст. палягаў шэраг нявырашаных за папярэдні час унутрыпалітычных пытанняў, галоўнае з якіх – права спадчыннай уласнасці на зямлю для ўсіх катэгорый феадальнага грамадства. Да ліку дасягненняў трэба аднесці вывучэнне выкарыстання свецкімі і царкоўнымі ўладамі ідэі “уніі” для ўсталявання кантролю над палітычным жыццём ВКЛ. Работа асвятляе асноўныя этапы ўнутрыпалітычнай барацьбы, складанне партый пры вялікіх князях і іх ўплыў на палітыку дзяржавы. У даследванні ўпершыню ўводзяцца ў навуковае абарачэнне актавыя і эпісталярныя крыніцы з фондаў Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве (AGAD).

**Практычная (эканамічная, сацыяльная) значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі праведзенага дысертацыйнага даследвання ствараюць аснову для далейшага вывучэння праблемы і

вызначаюць сучасныя перспектыўныя накірункі даследвання. Высновы могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы лекцыйных і спецыяльных курсаў, абагульняючых прац па гісторыі Беларусі. Атрыманая інфармацыя можа быць карыснай для даследванняў у галіне генеалогіі, пры вывучэнні трансфармацыі палітычнай улады і царкоўнай гісторыі, інтэграцыйных працэсаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, тэорыі палітычных эліт.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, прапанаваныя да абароны:**

1. прычынай унутрыпалітычнай барацьбы з'яўлялася дыспрапорцыя правоў на валоданне зямлёй паміж рознымі катэгорыямі феадалаў дзяржавы, а таксама нявырашанасць пытанняў размеркавання ўлады паміж цэнтрам і рэгіёнамі;
2. для вырашэння эканамічных і палітычных праблем пад час перыяду адбываецца ўтварэнне "партый", якія імкнуліся ўсталяваць непасрэдны кантроль над асобай вялікага князя;
3. падзеі ваеннага канфлікта разгортваліся на двух франтах: паўночным і паўднёвым. Калі на першым яны характарызаваліся штучнымі акцыямі па ўсталяванню вярхоўнай улады над асноўнай тэрыторыяй ВКЛ, то на другім адбывалася вайна з Польскім каралеўствам за памежныя тэрыторыі;
4. пасля смерці вялікага князя Жыгімонта ўнутрыпалітычная барацьба не скончылася, а перайшла ў форму супрацьстаяння цэнтра і рэгіёнаў;
5. выкарыстанне ідэі царкоўнай уніі і становішча ў Царкве пасля Фларэнтыйскага сабора 1439 г. дазволіла свецкім і царкоўным уладам кантраляваць грамадскае жыццё ВКЛ;
6. вялікакняжацкая ўлада ў 40-ыя гг. XV ст. выкарыстала лакальныя канфлікты і прывілеявання асобных зямель і катэгорый насельніцтва для стабілізацыі ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў дзяржаве.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя з'яўляецца ўласным даследваннем дысертанта, цалкам выкананым самастойна. Праца заснавана на вывучэнні разнастайных дакументальных матэрыялаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Галоўнага архіва старажытных актаў (AGAD) у Варшаве, Дзяржаўнай грамадскай гістарычнай бібліятэкі Расіі ў Маскве; на вялікім апублікаваным дакументальным матэрыяле, на ўсебаковым аналізе дасягненняў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Праведзеная праца дазволіла сістэматызаваць і паглыбіць веды аб прычынах, характары, рухаючых сілах, мэтах, задачах і выніках ўнутрыпалітычнай барацьбы 30-40-х гг. XV ст. і прапанаваць комплексны погляд на гэту сацыяльна-палітычную з'яву.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Матэрыялы і вынікі дысертацыйнага даследвання былі прадстаўлены на 8 рэспубліканскіх і

міжнародных навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: “Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы (Гомель, 22-23.05.2003 г.), “Выкарыстанне сучасных даследчых тэхналогій і методык у гістарычнай навуцы” (Гродна, 7-9.11.2003), “Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі” (Мінск, 28.11.2003), “Славянскі свет: мінулае і сучаснае” (Мінск, 26.03.2004), “XXI стагоддзе: актуальныя праблемы гістарычнай навукі” (Мінск, 15-16.04.2004), “Канструкцыя і дэканструкцыя Вялікага Княства Літоўскага” (Гродна, 23-25.04.2004), “Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць” (Брэст, 7-8.10.2004); “Романовские чтения II” (Магілёў, 10-11.11.2005).

**Апублікаванасць вынікаў.** Вынікі дысертацыі апублікаваны ў 3 артыкулах ў навуковых часопісах, матэрыялах 5 навуковых канферэнцый. Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 30 старонак.

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыя мае наступныя часткі: уводзіны, агульную характарыстыку працы, тры главы, заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц. Поўны аб’ём дысертацыі складаецца з 121 старонкі, з якіх 21 старонку займае бібліяграфія. Спіс выкарыстаных крыніц налічвае 269 адзінак.